# ВЫХАВАННЕ ГРАМАДЗЯНІНА-ПАТРЫЁТА Ў РЭГІЯНАЛЬНЫХ МУЗЕЯХ БЕЛАРУСІ (на прыкладзе Клімавіцкага краязнаўчага музея)

**Л. У. Ляховіч,** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

У кожнага чалавека ёсць вялікая радзіма – гэта дзяржава, грамадзянінам якой ён з’яўляецца. Але кожны чалавек мае і малую радзіму – тое месца, дзе ён нарадзіўся і жыве, адкуль паходзяць яго бацькі і дзяды, дзе прайшло яго дзяцінства; менавіта адгэтуль пачынаецца Радзіма, куды б потым яго ні прыводзіла жыццё.

Усведамляючы гэта, лёгка зразумець важнасць і запатрабаванасць работы рэгіянальных музеяў у патрыятычным выхаванні і фарміраванні культурнай і моўнай ідэнтычнасці. Рэгіянальныя музеі даюць грамадзянам першапачатковыя веды па краязнаўстве, прыродазнаўстве і айчыннай гісторыі. Вельмі важна, што веды ілюструюцца знаёмым, мясцовым матэрыялам, які натуральна ўспрымаецца як родны. Кожны музей, зразумела, мае свае асаблівасці працы, зыходзячы з наяўнасці кадраў, матэрыяльных магчымасцей, мясцовай спецыфікі. Рознымі могуць быць і вынікі. У гэтым сэнсе культурна-адукацыйная і выхаваўчая дзейнасць Клімавіцкага раённага краязнаўчага музея з’яўляецца не толькі выніковай, але і вартай пераймання.

Музей заснаваны 11 ліпеня 1978 г. у адпаведнасці з рашэннем Бюро ЦК КПБ «Аб стварэнні гісторыка-краязнаўчага музея ў г. Клімавічы» і пастановай ад 11 снежня 1978 г. Магілёўскага абласнога ўпраўлення культуры. Колькасць прадметаў асноўнага фонду на 01. 01. 2012 г. – 6598 адзінак. Найбольш значныя экспанаты – старадрукаваныя кнігі: Трэбнік (XIX ст.), «Мінеі» (1868 г.), зуб шарсцістага насарога (30–15 тыс. гадоў таму назад), прадметы народнага адзення XIX ст.

Музей размешчаны ў помніку архітэктуры XIX ст. – жылым доме, які быў пабудаваны ў 1867 г. і належыў князю М.М. Мяшчэрскаму [1] і ў якім у Клімавічах пражывала дачка князя Мяшчэрскага.

У цяперашні час у музеі захавалася экспазіцыя, створаная ў савецкія часы, аб чым сведчаць як сама яе пабудова, так і дэкор. Структура экспазіцыі была аптымальнай на час стварэння. Трэба

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сказаць, што яна прымальная сёння, калі весці размову пра маштаб краязнаўчага музея. Гэта раздзелы, прысвечаныя прыродзе краю, далёкаму мінуламу, рэвалюцыйным падзеям, Вялікай Айчыннай вайне, сучаснаму развіццю раёна, знакамітым землякам і інш. Разам з дырэктарам музея Л.М. Андрушковай працуе невялікі, але аддадзены сваёй рабоце калектыў, які, нягледзячы на непазбежныя ў наш час арганізацыйныя і фінансавыя складанасці, шмат дасягнуў у справе выхавання, адукацыі, зберажэння і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны [2]. За апошнія гады музей адзначаны наступнымі ўзнагародамі: дыпломам I ступені за перамогу ў абласным аглядзе-конкурсе на лепшы музей па патрыятычным выхаванні моладзі, прысвечаным 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (2009); дыпломам II ступені за ўдзел у рэспубліканскім аглядзе-конкурсе па ваенна-патрыятычным выхаванні (2009); дыпломам I ступені за перамогу ў абласным спаборніцтве на лепшую арганізацыю работы па захаванні і развіцці культуры Магілёўшчыны (2011).

Супрацоўнікі музея стварылі 24 тэматычныя музейныя заняткі, большасць якіх забяспечана мультымедыйнымі прэзентацыямі [1]. З іх прымяненнем праходзяць аглядныя і тэматычныя экскурсіі – «Прырода краю», «Далёкае мінулае», «Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя», «Знакамітыя землякі», «Прамысловасць раёна», «Традыцыі і абрады», «Беларуская хатка», «Свет прыроды роднага краю», «Беларускі нацыянальны касцюм», «Урок у гімназіі», «Забытыя рамёствы», «Нітачка за нітачкай», «Ганчарная справа на Клімаўшчыне» і інш. [3].

Музей працуе з разнастайнымі катэгорыямі наведвальнікаў, акцэнтуючы ўвагу на музейнай педагогіцы і звяртаючыся ў асноўным да дзіцячай і юнацкай аўдыторыі, на што накіраваны шэраг музейных распрацовак. Менавіта школьнікі з'яўляюцца асноўнымі наведвальнікамі музея. Аднак у апошні час у музей сталі прыходзіць дарослыя, каб пазнаёміцца з экспазіцыяй.

Дамінуючай формай культурна-адукацыйнай дзейнасці музея з'яўляюцца музейныя заняткі, аб чым сведчыць велізарная колькасць распрацовак і накопленага матэрыялу. Дзеці і падлеткі малююць, займаюцца выцінанкай, вывучаюць і аднаўляюць каляндарныя абрады і святы, спяваюць, гатуюць і г.д. Пры гэтым работа вядзецца не толькі ў музеі, дзе вельмі абмежаваныя плошчы, але і ў школах, дзіцячых садках, сем'ях, дзе ёсць сацыяльна неабароненыя дзеці. У раёне існуе сацыяльны цэнтр, штомесячна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работнікі музея працуюць з інвалідамі-дарослымі. Заняткі рэалізуюць наступныя задачы:

– развіццё эмацыянальна-пачуццёвай сферы асобы дзіцяці;

– развіццё творчых здольнасцей, стваральных якасцей асобы;

– выхаванне чалавека гуманістычнай культуры;

– ператварэнне школы з пераважна асветнай установы ў цэнтр духоўнай, маральнай, эстэтычнай культуры.

Калі тэматыка музейных заняткаў звернута да малодшых школьнікаў, яны праводзяцца ў форме гульні. Так, святам народнага календара прысвечаны гульнявыя праграмы «А ў нас на Каляды…», «Шырокая Масленіца», «Вясновае свята птушак», «Свята свят», «Народная свята Троіца» і інш. З гісторыяй паўсядзённасці дзеці знаёмяцца на такіх занятках, як «Ад капейкі да рубля», «А музыка гучыць…», «Мэбля мінулых гадоў», «Як хлеб да стала дайшоў», «Аб чым гаворыць лучына», «З гісторыі “паздравішак” і не толькі….», «Хто кажа ў гадзінніку “цік-так”», «Беларускі ручнік. Традыцыі і сучаснасць». Прырода прадстаўлена featureнымі тэмамі («Свет прыроды», «Знаёмыя незнаёмцы», «Расліны – лекары», «Лясная канцылярыя», «Пчолка-цуд», «У свеце матылькоў», «Суседзі па планеце», «Вясны і восені кветкі», «Грыбное царства»).

Для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту прызначаны лекцыі «Беларуская сімволіка», «Беларускія асветнікі», «Беларуская хатка», «Старажытнае свята Івана Купалы», «Клімаўчане – героі Савецкага Саюза», «Знакамітыя землякі Клімаўшчыны», «Асаблівасці іканапісу на Беларусі. Вобразы святых у іканапісе», «Распрацоўшчыкі ракетна-касмічнай тэхнікі», «Клімаўшчына ў часы Вялікай Айчыннай вайны», «Клімавіцкія ручнікі з вышытымі надпісамі» і інш. [3].

Музей арганізуе таксама выязныя экскурсіі – на страусавае ранча (Клімавіцкі р-н, в. Сабалёўка), святыя крыніцы (в. Стары Дзедзін і інш.). У 2010 г. музей прыняў удзел у праекце «Сем цудаў Клімаўшчыны», распрацаваным Клімавіцкім райвыканкамам. Да святкавання юбілея вёскі Стары Дзедзін Клімавіцкага раёна супрацоўнікамі музея было падрыхтавана і праведзена (14 жніўня) мерапрыемства па адраджэнні абраду «Асвячэнне вады» [1].

Характарызуючы работу музея, патрэбна асаблівую ўвагу звярнуць на тое, што ўласнымі намаганнямі супрацоўнікі яго не толькі праводзяць музейныя заняткі, іншыя мерапрыемствы, але і ствараюць патрэбныя дыдактычныя матэрыялы для дзяцей – кніжкі для размалёўвання, папяровыя загатоўкі для выцінання да розных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свят (Вялікадня, Новага года і інш.). Трэба адзначыць, што ўвесь матэрыял пры гэтым бясплатны для дзяцей, што садзейнічае прыцягненню наведвальнікаў у музей. Вельмі важна, каб дзіця самаручна размалявала і выразала з паперы велікоднае яйка, цацку для навагодняй елкі і інш. На музейных занятках, святах, ранішніках праводзіцца бяспройгрышная латарэя. Прызы, што разыгрываюцца, дзеці таксама ствараюць самі.

Важным кірункам работы музея з'яўляецца выпуск друкаванай і сувенірнай прадукцыі. З аднаго боку, гэта папулярызуе музей, а з другога – дае сродкі. Выданні выходзяць з выкарыстаннем фатаграфій з фондавага матэрыялу. Гэта – «Клімаўчане – героі Савецкага Саюза», «Святыя крыніцы Клімаўшчыны», «Жыццё ідзе…», «Спартыўная гордасць Клімаўшчыны» і інш. З 1995 г. у Клімавічах праходзіць Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка». З гэтай нагоды была выдадзена брашура «Залатая пчолка – ад фестывалю да фестывалю». У 2012 г. выйшаў зборнік «Это наша с тобой история». Па сутнасці гэта летапіс Клімаўшчыны, які на працягу 2011–2012 гг. друкаваўся на старонках раённай газеты «Родная ніва». Калі ў 2011 г. музей падрыхтаваў 47 публікацый у сродках масавай інфармацыі, то ў 2012 г. іх было ўжо 60. Наладжана супрацоўніцтва з раённым радыё «Голас Клімаўшчыны». У 2012 г., напрыклад, былі падрыхтаваны 24 перадачы, якія прысвячаліся памятным падзеям, знакамітым землякам, народным абрадам і святам [4]. Музей стварае і рэалізуе сувенірную прадукцыю (падвеску ў выглядзе залатой пчолкі, сувеніры на магнітах – выявы памятных месцаў Клімаўшчыны, экспанатаў музея і інш.).

У музеі адкрылася новая зала этнаграфіі, у перспектыве – аднаўленне экспазіцыі, прысвечанай Вялікай Айчыннай вайне (у 2013 г. адзначаецца 70-годдзе вызвалення Клімавіцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў). У планах – стварыць інтэр'ер арыстакратычнага дома другой паловы XIX–XX ст. з адпаведнай экспазіцыяй [4].

Музей і музейны калектыў жывуць праблемамі свайго часу. Для пашырэння і змены экспазіцыі музею выдзелены грошы. Аднак у будучым пажаданы і новыя плошчы. Дом князя Мяшчэрскага – гэта хаця і вялікі па памерах дом другой паловы XIX ст., але для музея як сучаснай сацыякультурнай установы патрабуюцца іншыя маштабы і ўмовы. Заслугоўваюць глыбокай пашаны і ўвагі ў грамадстве музейныя работнікі – людзі, якія самаадданна і з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

энтузіязмам працуюць тут. Усведамленне важнасці выхавання грамадзяніна-патрыёта, чалавека, які атаясамлівае сябе са сваёй радзімай, ведае, беражэ і шануе сваю гісторыка-культурную спадчыну – гэта ў значнай ступені гарантыя будучыні дзяржавы.

---


1. *Клімавіцкі* раённы краязнаўчы музей // Першы нацыянальны форум «Музеі Беларусі», г. Гродна, 12–14 кастр. 2012 г. – Гродна : Юстмаж, 2012. – С. 127–129 .

2. *Андрушкова, Л.М.* Супрацоўнікі краязнаўчага музея // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Клімавіцкага раёна. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – С. 638–639.

3. *Матэрыялы* бягучага архіва УК «Клімавіцкі раённы краязнаўчы музей».

4. *Матэрыялы* інтэрв'ю аўтара са старшым навуковым супрацоўнікам УК «Клімавіцкі раённы краязнаўчы музей» Д.А. Эверс.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ